БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспонданцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Менску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 39. Менск. Субота 11 мая 1918 г. Год I

Менск 11/г.

Народы, маючыя свае нацыянальныя асобнасьці, над якой бы мацнейшай рукою яны ні знайходзіліся-б, як бы тая бязлітасная рука ні старалася сцерці гэтыя асобнасьці і асымілеуваць паднявольны народ—гэта рэдка і слаба удаецца.

А калі віхор гістарычнаго лёсу адкідывае ад плячоу народа—нівольніка гэту жалезную руку, тады усе здабыванні народа дзержаунаго, закабальнічыка разыходзяцца у павуціну і прыродныя самабытныя формы пабрыуджэнаго народа выступаюць рэльефна і значна—гэта закон прыроды.

Глауныя нацыянальныя асобнасьці беларускаго народу—цяга да культурнасьці, мягкасьць і дэлікатнасьць душы.

Мы ведаем, што у той час, калі у Масквы і іншчэ ніякаго друкаванаго слова ні было, ужо у беларускім Полацку друкаваліся кнігі. Біблія Францішка Скарыны друкавалася у тых часох, калі у Вялікаросіі аб гэтым іншчэ нават і ні думалі. У часе Літоускаго князьства перамагала беларуская культура над моцным узброеннем літоускіх князеу і усе кіраунінцтво князьства вялося на беларуску (Літоускі статут і інш.).

У той час, калі у Вялікаросіі і да апошняго дня уладжваліся спэцыяльныя жыдоускія пагромы, тут на Беларусі нічога падобнаго ні было, ні гледзючы на вялікія старанні наумысне каманд зірованных да гэтай справы расійскіх чорнасоценцау—беларускі селянін ні мог гэтаго рабіць.

У той час, калі у Вялікаросіі большэвізія рабіла сваю паганую крывавую работу, тут, па Беларусі, было куды цішэй; а тыя рэдкія эксцэсы, якія здараліся і у нашай тэрыторыі рабіліся па натхненню ні карэнных беларусау, а рознымі натоупамі вялікарасау і латышоу с фронту, якія наагул зьнішчылі гэты край да шчэнту у часе «Волі». Наш народ, ціхі і гуманны, ні мог нічога рабіць проціу такого нішчасьця.

І вось на грунці прыроднай культурнасьці нашаго народу і можна начаць нашу нацыянальную дзержауную будову. А калі выявіцца значна і будзе добра з'арганізована наша дзержауная сіла, то нават апаляченыя і абруселыя інтэлігэнты нашыя пачнуць свой зваротны адліу у роднае беларускае нацыянальнае моро, інтэлектуальна-багатае духам творчасьці—іх верне да нас народны інстынкт.

Толькі трэба нам памятаць адно, масса—гэта ніасьвядомленае дзіця, так што інтэлігэнцыя ні павінна ісьці за массаю, а-наадварот вясьці яе за сабою. Гэта нам значна паказала расійская рэвалюцыя. Нам трэба злучно, без партыйных межау, вясьці творчую працу над адбудаваннем *Нізалежнай Беларусі.*

Нам трэба адважна выступаць у новым паходзе народау, як нацыянальная адзінка, без якой бы сабе ні было апекі мацнейшаго славянскаго народу. Досінь мы ужо нераконапы у тым, што злучвасьць з якім бы сабе ні было культурнейшым ад нас славянскім народам—шкадліва для нашаго нацыянальнаго адраджэння; бо кожны славянскі народ будзе лічыць за абавязак шукаць саеей нібыто уласнасьці на Беларусі і паутарыцца над намі старая гісторыя над «тутэйшымі людзьмі». Мы павінны ісьці свайей уласнай дарогай, а калі можам сабе чакаць матэрыяльнай падмогі у пачатковай нашай працы ад каго нібудзь, дык толькі ад мацнейшаго за нас ніславянскаго народу. Тут ужо конкурэнцыі свяцтва ні будзе, як было да гэтуль ад палякоу і расійцау—і мы пойдзем сваім шляхам, маючы на гэта багаты самабытны грунт.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

— Німа у нас паноу, — жаліўся мне адзін з быўшых рыцараў большэвізіі,—ні было дзе папрацаваць нашым камітэтчыкам... німа у нас маёнткаў багатых,—дзе назапасіцца ні было, а цяпер,—трубі у кулак..,

І праўда ўся ваколіца №-ай воласьці бадай паноў ні мае на ліхо большэвікам. Нібы апенкі ўвакруг старых карчоў, каля вёсак разсыпана шляхта, і такая шляхта, што куды ні вярні — бяднейшая за вясковых селян. Але праца для «камітэтчыкаў» знайшлася і тут:

Хутаранам, купіўшым тут зямлю, загадалі выехаць у свае воласьці, скуль сюды панаеж джалі. Са шляхтай меліся пачаць на вясну праўдзівую вайну—адабраць зямлю і менне у карысьць і спажыванне вясковых селян.

— Ды што вы, людзі добрыя, гэта-ж нават у большэвіцкім дэкрэці аб зямлі пісалі чорным на белум, што «зямля належыць тым, хто на ей працуе», а мы самі працуем на гэтай зямельцы, бачце, во нашыя рукі!

Прадстаўнікі ад «партыі» хутаран і шляхты выстаўляюць на від свае мазольныя рукі і чуць ні у вочы тыкаюць агрубелымі пальцамі.— Гм... — кажуць камітэтчыкі — проціў «народнай волі» нічога рабіць ні можам.

— А калі «народная воля» захоча перарэзаць нас усіх дык што вы тады, таварышы камітэтчыкі, будзеце рабіць?

Апрача «г-м-м» «таварышы» камітэтчыкі на гэта запытанне болей нічога атказаць ні могуць. А сваім чынам шляхта і хутаране гардзіліся тым, што яны нараўне с панамі...

Выходзіло так, што кожная вёска была нізалежнай аўтономіяй; кожны «дэпутат» выдаваў дэкрэты па свойму ўласнаму уразуменню. Дэкрэты гэтыя ні друкаваліся і ні пісаліся нават, барані Божа, але пераказваліся ніграматным камітэтчыкам с такім гарачым пераканаанем, з такім натхненнем прарока—аракула, што «таварышы» слухачы іначэй як па «дэкрэтнаму» думаць ні маглі, дый... ні сьмелі.— «Ліхо яго ведае што можа быць калі гэтаго «дэкрэцу» ні споўніш. Як разумеецца...»

Рэзаць дык рэзаць, біць дык біць—на то «воля народа»... А «воля народа» граніц ні ведала і ўскідалася усё вышэй і вышэй, як човен на бурных хвалях мора.

З. Б.

З дарогі.

... Да граніцы Віленскай губ. па гэтай дарозе толькі 33 вярсты, і німа чым, праўду кажучы, пацешыць вока. Абапал дарогі аб якім бы двары ні запытаўся— больш, чы менш —зрабаваны ўсе, шмат дзе маленячкім фальваркам--беднаце нідаравалі. Найбольш даўся у знакі Ямпольскі полк, які стаяў у вёсцы Жукаўцы, на граніцы ўжо Віленскай губ. Ямпольскія салдаты былі пострахам на ўсю аколіцу. На грабежствы ішлі яны ні толькі ноччу, але і сярод белаго дня, рабуючы ўсё, што папало пад руку—пачынаючы ад крэслаў і канчаючы апошняй подушкай: усё гэта пакавалося на падводы і вывозілося на продаж у Менск. Калі прыняць пад увагу, што апрача гэтых гасьцей, наводзілі сврозь парадкі зямельныя камітэты, у якіх загадчыкамі былі Яраслаўскія і Маскоўскія большэвікі, то німа чаго дзівіцца, што, едучы па дарозе, бачыш нізагараныя палеткі і дзірваны. Німа жывёлы, німа снасьці, німа насення. і нат грашавому гаспадару наладзіць усё гэта с першаго року німа магчымасьці, дык трэба наперад прызнацца, што на поўны і добры ураджай сёліта надзея слабая.

Жыта, зразу відаць, ні было летась засеяна поўнасьцю, арунь, якая відаць абапал дарогі, ні зважаючы на раннюю вясну, выглядае нісамавіта і ў рост іншчэ мала скранулася. За тое сады паўнюсенькі, праўда іншчэ нірастпушчанаго, цвету. І будзе вялікае шчасьце, калі нашыя сады апошнімі халадамі крыху затрымаюцца распушчацца, бо раннія прымарозкі могуць згубіць усю надзею.

Але вось найцікаўнейшае, што кідаецца ў вочы падарожнаму, праехаўшаму—як я—больш трыццаці вёрст трактам: шмат дзе валяюцца запасы дрэва (як яны зьбіраліся—мы добра ведаем), але ніхто ні бярэцца ні толькі за новае, а і старой будыніны ні думаюць папраўляць. Азнака, нівялікая: народ іншчэ ні саўсім пазбавіўся той трывогі за будучыну, якая панавала у ім пры большэвіках.

Я. Ш.

Аб нас.

У апошнія часы,—побач с палітычным рухам на Беларусі, с прычын якога ва усіх эўропэйскіх часопісах і газэтах часта—густа друкуюцца артыкулы а Беларусі рознымі прыхільнікамі і праціўнікамі беларускаго адраджэння,—друкуюцца так—сама і кавалкі беларускай літэратуры.

Болей ўсяго мы гэта спатыкаем у віленскіх часопісах: газэта «Новый Вѣстникъ» амаль ні у кожным нумэры друкуе

беларускія вершы, стацці, апаведанні і г. д. «Wilnaier Zeitung» друкуе пераклады з беларускага па нямецку.

Ці беларускі народ ёсць народам, мова яго—мовай, а літэратура—літэратурай?

Гэтым пытаннем зацікаўлены цяпер тыя народы, які маюць стычнасьці з беларускай тэрыторыяй. Усё гэта служыць пробным каменем для беларускай справы. Тыя людзі, каторым беларуская справа здаецца новай, з неба зваліўшэйся, углубляюцца, шукаюць і наказываюць.

У ніасьвядомленнасьці ва усіх гэтых пытаннях дагэтуль вінінаваты болей усяго тыя славянскія браты нашыя, пад чыей апекай мы жылі цэлымі векамі. Яны сістэматычна старaліся затушоўваць нас перад другімі народамі...

Вінаваты у гэтым і мы самі—наша нідбаласьць.

У час Усебеларускага з'езду у Менску нават жыўшыя векамі у суседзстві з намі жыды пісалі аб нас у сваіх газэтах, што «нараджаецца новы народ». («Вэкер»).

А геніяльны прэдстаўнік нямецкаго народў генэрал фэльдмаршал Гіндэнбург казаў аб нас у Бэрліне, што на берагох Нёмна ён знайшоў новы народ.

Нехай гэтыя «адкрыцці» ідуць далей, а разам з імі мы нажадаем, каб і наша беларуская інтэлігэнцыя, узгадованая на расійскай або польскай культуры, «адкрыла» сама сябе—даўно пара!

Я—р.

Агульныя вести.

БЭРЛІН 7 гм. «Вольф». У надпісаным сягоння мірным трактаці паміж Нямечынай, Аўстра-Вэнгрыяй, Балгарыяй ды Турцыяй з аднаго, а Румыніяй з другога боку, напачатку гаворыцца, што гэвыя дзержавы пастанаўляюць: падпісаны 5 сакавіка 1918 году у Буфтэа мірны праэкт, становіцца трактатам міру.

БЭРЛІН 8 гм. «Вольф». У глаўнай камісіі Рэйхстагу генэрал фон Врысбэрг на пачатку нарады даў атказ на зробленае учора запытанне,—ці праўда, што нямецкія войскі маршыруюць на Пецярбург—што глаўнае камандаванне нічога аб гэтым ні ведае. Нямецкія войскі ў ніякім разе ні ўходзяць у справу пры азначаным маршу.

БЭРЛІН 8 гм. «Вольф». Я. Ц. М. Цэсар зрабіў сягоння візыту імпэрскаму канцлеру і забавіўся у яго каля гадзіны. Цэсар уручыў канцлеру пры гэтым выпадку жалезны крыж 1 клясы.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. 8 г. м. «Вольф». Малы турэцкі крэйсэр «Мэджыдіо», які наскочыўшы на міну 3 красавіка 1915 году затапіўся перад Адэсай, а потым надняты Расіяй і перайменаваны на «Брут» быў ўключаны у Рускі флот цяперака зноў ўключаны у знаходзячыся у Сэвастопалю турэцкі флот.

БУКАРЭШТ. 7 г. м. «Вольф» Пасьля надпісання мірнаго трактату імпэрскі статс-сэкрэтар ф. Кюльман у аўторак пасьля поўдня выехаў Букарэшту. Ен выехаў у таварыстве старшыні балгарскаго габінэту міністраў Радаславова на кароткі час у Софію, а стуль у сераду балканскім цягнікам меўся выехаць у Бэрлін.

ЦЮРЫХ. 7 г. м. Газэты паведамляюць, што англічане наладжываюць эвакуацыю вялізных запасных складаў у Іпру і Бонерык у нямецкія рукі,

РОТТЭРДАМ. 7 г. м. У англьскай ніжняй палаці на запытанне Сноудэна Бальфур атказаў. Цэціль зрабіў паведамленне, але я ні магу сказаць, што згадзіўся-бы паўтарыць гэта паведамленне у другу. За апошні час ні было ніякай мірнай прапазыцыі. Так сама у Англіі німа ніякога прэдстаўніка нейтральнай дзержавы каторы стараўся-бы абмінаючы урадовую дарогу надгатаваць мірныя перагаворы. На далейшае запытанне Бальфур адказаў: я думаю што вестка з Гаагі з'яўляецца нізайгранай балтаўнёй.

ВАШЫНГТОН. 7 г. м. «Réuter». Ваеннае міністэрство запатрэбавало ад кангрэссу ассігнавання мільярду долароў на будаванне самалетаў апрача выданых ужо па гэты кошт 640,000,000, долар.

БЭРЛІН. 6 г. м. «Вольф» «Lok. anz.» паведамляе з Копэнгагі, што подлуг тэлеграмы з Гельсінгфорсу усе фінляндскія газэты, выказуюцца цяпер за увядзенне у Фінляндзіі монархіі.

З ТОКІО ад 6 г. м. паведамляюць аб арэшце у Іркуцку японскаго віцэконсула і праўлення японскаго таварыства. Рускія улады вінавацяць арыштаваных у шпіенстві.

У маевую ноч...

У маёвую ноч,
Калі зоры гарадь,
Калі з гаю чуваць
Пераліў салаўя,
Калі лес ні шуміць,
І ручай ні бурліць,—
Штось таёмнае я
Бачу ў гэткую ноч.

* * *

У маёвую ноч,
Калі вецер гудзе,
Навальніца ідзе.
Калі неба усё
Ад маланкі гарыць,
І страшэнна грыміць,—
Замірае маё
Сэрцо ў гэткую ноч.

* * *

У маёвую ноч
На душы весялей,
А на сэрцы цяплей;
І мяне забыццё
Абхапляе тады:
Німа жалю, жуды...
Так чароўна жыццё
У маёвую ноч.

Ю. Ф.

Менск.

Весткі с Польшчы.

Прэдстаўніком нямецкіх калакістаў у Польшчы у Радзе Стану будзе п. Е. Кашуб найменованы Рэгенцкай Радай з кандыдатаў прэдстаўленых нямецкім звязкам.

— Подлуг 18 артыкулу уставы Дзержаўнай Рады назначэнне яе старшыні, каторы мае іменавацца маршалкам, належыць Рэгенцкай Радзе. Справа назначэння старшыні жадта цікавіць польскія палітычныя партыі, якія стараюцца каб маршалкам быў іменованым кандыдат іхняго боку. Тыя, што далучаюцца да пасывістаў, высоўваюць на гэта становішча п. Стэфана Бодзьеньскаго з Седлецкаго округу. Актывістычныя партыі цікавяцца цяпер болей іншай справай—стварэннем двух ці трох палітычных клюбаў каторыя-б працавалі разам у Радзе стану, сходзячыся на аднэй пляцформі.

— У апошніх днях у Варшаву з Менска, Барановіч, Рэвэлю, Вілейкі, Беластоку прыбыло нескольki партыяў уцекачоў. Па скончэнню рэгістрацыйных формальнасьцяў, прышчапанню воспы і накармлення на пункце у Повозках, уцекачы з Варшавы былі адпушчаны па дамох, а з другіх губэрняў асталіся на пункце да часу далейшай адпраўкі,

Польская Краевая Касса ад прошлаго чацьвергу перастала прыймаць «Керэнкі.» Прымаюцца толькі «царскія» паперкі: Dz Polski» піша што аб гэтым трэба было-б паведаміць усіх палякоў якія збіраюцца дамоў.

— У аўторак 7 гм. члены жыдоўскай камісыі міністэрства вераспаведанняў падалі у Раду міністраў праэкты уставы і выбараў арганізацыі жыдоўскіх абшчын у Польшчы с прозьбай гэтыя праэкты зацьвярдзіць.

— 19 мая у Варшаві адбудзецца з'езд валасных пісароў с Польшчы, які мае мэтай давясьці да канца арганізацыю проф. зьвязку валасных пісароў, устава каторага зацьверджана у 1918 годзе.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Харчэвы аддзел упраўлення Л. Р. ж. д. атрымау з Украіны дзеля патрэб служачых два вагоны пшанічнай мукі, тры жытняй мукі і тры вагоны круп і фуража.

Гэтаму дапамагла паездка самаго старшыні коопэратыуна-харчавога бюро упраулення Прэображэнскаго на Украіну, каторая абецалася павялічыць выдачу харчоу Л. Р. ж. д.

Як мы даведаліся разьмен царскіх рублеу у разьменнай канторы па курсу 1,25 мр. будзе цягнуцца толькі да 15—VI—1918 г. Прычына гэткай меры тая, што ніустрымна бягучае паданне рускаго рубля й, глауным чынам, прасходзячае у вагромным ліку, друкаванне царскіх рублеу вядуць да таго, што рублі прывозяцца з Расіі для абмену тутака у разьменных канторах. Аднак жа кабдаць магчымасьць тутэйшаму насяленню абмяніць знаходзяшчыяся у яго рублі, установлена, як апошні срок, вышэй паказаная дата. Ці будзе наагул разьменная кантора прымаць рублі якога б ні было кшталту для абмену й пасьля гэтаго сроку, залежыць ад далейшаго разьвіцця грашавых (фінансавых) адносінау у Расіі.

Мешчанская Управа, пасьля ліквідацыі сваіх спрау пяцідворнымі дэпутатамі, далучыцца да грамадзянскаго аддзелу местоваго самаупраулення, прычым ніхто з састава яе выбарных асоб ні будзе мець на далей сваей пасады. Агульны сход пяцідворных дэпутатау для ліквідацыі мае быць у канцы мая.

Беларуская школа—прытулак (Захароуская, б. школа для сьляпых) апекуецца цяпер над 29 дзяцьмі, з іх—22 дзяучынкі.

Ні гледзючы на кароткі срок пасьля пераходу школы (ад красавіка месяца, дзякуючы цяперашняй загадчыцы прытулкам, дзеці матэрыяльна абязпечаны усім патрэбным. Від у дзяцей давольны і добры; вучэнне і уся пастаноука справы (адміністрацыя і выхаванне) пастаулены вельмі добра.

У тутэйшай Украінскай грамадзе выдача пропускау для жадаючых ехаць на Бацькаушчыну часова прыпынена. Сягоння 11-го мая у памешканні грамады адбудзецца паверачная рэгістрацыя ахвіцэрау, дахтароу і чыноунікау. 12 мая—рэгістрацыя салдатау—тым, што ні прыдуць харчы ні будуць выдавацца.

У новых бонавых кніжках, па якім будзе выдача прадуктау с 15-го мая, есьць адзначэно для выдачы: цукер, «пшанічная мука» і жытні хлеб. пасьля есьць адзел запасных бон; апошні срок на права атрымання харчоу па гэтых кніжках—люты 1919 года. Плата за кніжку—50 кап. пры адной порцыі і—25 кап. с кожнай порцыі, калі іх больш адной

Слухі аб уменьшэнні хлебна
га пайка—ніпраудзівыя. На
адварот: хлебны паек пра
колькі часу мае быць павялі
чэны (с пачатку для рабочы
да 1 ф. у дзен.)

У пажарным таварыстве та
моцна парэдзеушым членам
за час вайны, глаунае у быт
насьць начальнікам яго «вя
домаго» адваката Поніквіц
каго (добра вядомы па упрау
ленню справамі т-ва «Міла
сэрдзія» і г. д.) цяпер, с выб
раннем на пасаду начальнік
аквотнікау генэрала Сокаль
скаго, намечано паміж іншы
павялічэнне кадрау пажарні
кау. Апрача гэтаго, дзеля ка
рысьці справы, проэктуец
злучэнне вольна - пажарнаг
т-ва местовай каманды у адн
цэлае пад кірауніцтвам Со
кальскаго.

Цяперашні местовы бранд
мэйстр Ярмоловіч, мала зра
біушы дзеля наладжэння па
жарнай арганізацыі наогул
зусім ні пастарауся а паля
шэнні жылішч местовых па
жарных, дзе людзі папакова
ны нібы селядцы у бочках.

Сокальскі, пры вербоуц
новых членау вольна-пажа
най дружыны, па мажлівась
будзе звертаць увагу на м
ральнасьць і асьвядомле
насьць членау. Вельмі папс
тыя фінансовыя справы т-в
прапануецца папрауляць п
куль што добрахвотным ст
раннем саміх местовых жы
хароу.

Спрод арэндатароу на зя
лях камароускаго вотчыні
Ванькові ча есьць чуткі, ш
пытанне аб судзебных рэпр
сіях проціу 200 нідаімшчык
за час вайны зьняты с чар
ду да збору ураджаю.

Дзякуй і за гэта, але ящ
гуманней было-б зрабіць да
жэйшую адсрочку і рабі
выплату па часьцям, як гэ
зрабіу зямл яуласьнік Немо
шанскі і інш.

Ва «У. З. С.» у скуранны
аддзелі б. загадчыкамі ш
вецкімі атрадамі пачаты ра
езды па бліжэйшых павет
(болей усяго у Слуцкім) дзе
звароту ад селян скураны
запасау, выданых ім на «хр
ненне» перад прыходам пол
скіх легіянэрау.

Што тычыцца заказау «
З. Саюзу» у «крэдыт» б. па
кавымі часьцямі заходня
фронта, цяпер бадай цэлік
эвакуіраванымі, то ад іх у
чыста і гладка.

Гэтаго доугу за вайсковы
часьцямі лічыцца да 5,000,0
руб, ні лічучы смаленскіх ц
тральных складау, увесь б
гацейшы скураны запас, к
торы згінуу да акупацыі ні
ведама куды.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоунага камандавання за 10 мая 1918 року.

ЗАХОД: На палех бітвы на працягу дня артылерыйская чыннасьць была рухаваю ў ваколіцы Кэммеля па абодвых бакох р. Люс й на заходнім беразі Аўры. З ўзмацнеўшым артылерыйскім агнем пачыналіся варожыя атакі. Пры іх адбіванні й пры разьведках мы узялі палонных. У вечары і ў працягу ночы артылерыйскі агонь шмат разоў ажыўляўся між Іверам й Уазаю.

А больш на фронці баевая чыннасьць абмяжоўвалася разьведчыцкімі схваткамі.

З іншых фронтаў ніякай навіны.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтво Т-во «Заранка».
Друк. Я. А. Грынблята.